| | |
|---|---|
| **Буда-Кашалёўскі раённы выканаўчы камітэт** | **Буда-Кошелёвский районный исполнительный комитет** |
| АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ | ОТДЕЛ ОБРАЗОВАНИЯ |
| **ЗАГАД** | **ПРИКАЗ** |
| 21.01.2026 № 39 | |
| г. Буда-Кашалёва | г. Буда-Кошелёво |

Аб выніках правядзення раённага этапу
V Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу
даследчых праектаў навучэнцаў
“Нашчадкі традыцый”

У адпаведнасці з загадам аддзела адукацыі Буда-Кашалёўскага райвыканкама ад 02.07.2025 №529 “Аб правядзенні першага і другога этапаў V Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”, з мэтай патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэння рэгіянальных народных традыцый і развіцця даследчай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва ў ліпені-снежні 2025 года праводзіўся раённы этап V Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў «Нашчадкі традыцый» (далей – конкурс).

У конкурсе прынялі ўдзел дзяржаўныя установы адукацыі (далей – ДУА) “Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалеўскага раёна”, ДУА “Шырокаўская СШ”.

На падставе вышэйпададзенага і рашэння журы

ЗАГАДВАЮ:

1. Прызнаць пераможцамі і прызёрамі конкурсу, узнагародзіць дыпломамі аддзела адукацыі Буда-Кашалёўскага райвыканкама наступных удзельнікаў конкурсу:

I ступені – Малынову Дзіяну, Жыліцкую Соф’ю, Рагавога Максіма, Камарову Дар’ю, Жарына Кірыла, навучэнцаў Народнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Чараўніцы” ДУА “Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна” (кіраўнікі Крыкун Святлана Віктараўна, Жарына Лілія Мікалаеўна);

III ступені – Зайцаву Ксенію, навучэнку аб’яднання па інтарэсах “Наша спадчына” ДУА “Шырокаўская сярэдняя школа Буда-Кашалёўскага раёна” (кіраўнік Зайцава Марына Анатольеўна).

2. Кіраўнікам дзяржаўных установ адукацыі “Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна” (Зыблева І.Б.), “Шырокаўская сярэдняя школа Буда-Кашалёўскага раёна” (Будзянкова Н.В.) разгледзець магчымасць матэрыяльнага заахвочвання настаўнікаў, якія падрыхтавалі пераможцаў і прызёраў конкурсу.

3. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка начальніка аддзела Козыраву Н.В.

Начальнік аддзела Н.М.Раманава

Намеснік начальніка аддзела
Козырава Н.В.

Стурніекс 7 05 70
Камарова І.В. 7-47-59